***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.***, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Працяг. Пачатак гл. № 9–12 за 2022 г.*

## ТЭКСТ

### Урок* 58. Тэкст. Прыметы тэксту

***Мэты ўрока:*** фарміраваць агульнае паняцце пра тэкст, яго асноўныя прыметы (сэнсавае адзінства сказаў, пэўная паслядоўнасць), уменне складаць тэкст са сказаў, знаходзіць недакладнасці ў тэксце і выпраўляць іх, правільна афармляць тэкст на пісьме; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне, уменне пісаць па памяці, тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; выхоўваць пачуццё павагі і любові да маці.

***Абсталяванне:*** аўдыязапіс калыханак на беларускай мове.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 69.***

Вучні называюць, чаму прапанаваны сказ можна назваць небыліцай, што ў ім неабходна выправіць.

Праводзіцца ўзаемаправерка выкананага пісьмовага задання. Пасля чаго вучні ўспамінаюць правілы, якія прымянялі для вызначэння правільнага напісання слоў з прапушчанымі літарамі і знакам. *(Правапіс літар **е**, **ё** — **я**, літар **о**, **э**, — **а** (прыляцела, у хляве, карову); правапіс апострафа (з'ела).)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік і два падрыхтаваныя вучні чытаюць па ролях праблемную сітуацыю на с. 49 вучэбнага дапаможніка. Вучні выказваюць свае меркаванні адносна таго, чаму дзядуля не зразумеў Чамучыка.

Настаўнік прапануе вучням папрацаваць у парах і абмеркаваць, пра што Чамучык мог расказваць дзядулю. Выслухоўваюцца разважанні вучняў. Настаўнік цікавіцца, якімі падзеямі вучні дзеляцца са сваімі дзядулямі.

Настаўнік робіць абагульненне: у вучняў атрымалася звязнае выказванне на пэўную тэму — атрымаўся тэкст.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік тлумачыць, што яны пачынаюць вывучаць новы раздзел «Тэкст», а тэма сённяшняга ўрока — «Тэкст. Прыметы тэксту».

— Паспрабуйце сфармуляваць мэты ўрока. Што пра тэкст вы ўжо ведаеце?

***Практыкаванне 70.***

Пасля чытання тэксту вучням прапануецца адказаць на пытанні:

— Ці звязаны сказы па сэнсе? Якія сказы з'яўляюцца лішнімі? Чаму? Пра каго атрымаецца тэкст, калі ўбраць лішнія сказы? Прачытайце тэкст, які ў вас атрымаўся.

Тлумачэнне правапісу прапушчаных літар у словах праводзіцца франтальна. Узор тлумачэння: «Вымаўляю слова — [п'ачэ]. Вызначаю націскны склад — [чэ]. У першым складзе перад націскам пішу ***я***». *(Пячэ, аладкі, пяшчотную, людзі, дзеці, глядзяць, спявае, бялізну.)*

Кожны вучань самастойна запісвае тэкст пра маці, папярэдне яго яшчэ раз можна прачытаць. Арганізуецца самаправерка выкананага задання.

Настаўнік прапануе вучням расказаць пра сваіх матуль, паразважаць, чаму мама — самы блізкі чалавек. Вучні ўспамінаюць калыханкі, якія спявалі ім матулі. Можна праслухаць аўдыязапіс фрагментаў некалькіх беларускіх калыханак, спецыяльна падабраных настаўнікам да ўрока. Пасля праслухоўвання калыханак праводзіцца гутарка пра іх характэрныя адметнасці.

Завяршаецца выкананне практыкавання абагульненнем, якое робяць вучні, адказваючы на пытанні настаўніка:

---

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

— Ці любыя сказы можна назваць тэкстам? Якія асноўныя прыметы тэксту?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 50) і вызначаюць, ці правільны вывад яны зрабілі.

***Практыкаванне 71.***

Настаўнік прапануе паслухаць верш і адказаць на пытанне: «Ці з'яўляецца верш тэкстам?» Вучні абгрунтоўваюць сваю думку. Затым самастойна чытаюць верш, расказваюць, аб чым у ім гаворыцца; апісваюць малюнкі, якія ўявілі падчас чытання. Вучні вызначаюць, у якой частцы тэксту гаворыцца пра ноч. *(Першыя тры сказы.)* Перад запісам па памяці гэтай часткі верша разбіраецца правапіс слоў на ўжо вядомыя правілы. Настаўнік папярэджвае, што гэта частка вершаванага тэксту, таму сказы трэба запісаць у слупок. Пасля запісу арганізуецца самаправерка, параўнанне з узорам у вучэбным дапаможніку.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 72.***

Вучні чытаюць сказы ўслых. Затым арганізуецца работа ў парах: складанне тэксту пра звычай, які існаваў раней. Значэнне слова *звычай* вучні ўдакладняюць у тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка. Адзін вучань чытае ўслых тэкст, які атрымаўся:

*Некалі існаваў звычай. У новую калыску матуля клала ката. Каток там добра выспіцца. У гэтай калысцы дзіця лёгка будзе засынаць. Прыемныя сны будуць сніцца яму ўсю ноч.*

Настаўнік прапануе вучням успомніць і расказаць, якія калыскі былі раней, з апорай на малюнак да практыкавання і тэкст пра калыскі, які чыталі ў першай частцы вучэбнага дапаможніка.

Каменціраванае пісьмо: вучні ў сшытках запісваюць тэкст, які атрымаўся, і тлумачаць правапіс слоў на вывучаныя правілы. З апорай на правіла вучні даказваюць, што яны запісалі тэкст. Настаўнік прапануе падлічыць, колькі сказаў у тэксце.

***Практыкаванне 73.***

Кожны вучань чытае верш самастойна, затым — адзін вучань услых. З апорай на раней набытыя веды і жыццёвы вопыт вучні тлумачаць, што ў вершы не так, вусна выпраўляюць памылкі.

— Пакажыце на малюнку жывёл, назвы якіх сустрэліся ў вершы. Назву якой жывёлы аўтар у вершы не называе, але вы здагадаліся па апісанні? *(Мядзведзь.)*

Настаўнік прапануе вучням скласці тэкст пра тое, хто як зімуе з апорай на малюнкі. Запіс тэксту арганізуецца на дошцы і ў сшытках.

Магчымы варыянт тэксту:

*Зімуюць жывёлы па-рознаму. Вавёрка спіць у дупле дрэва. Мядзведзь спіць зімой у бярлозе. Казулі харчуюцца парасткамі дрэў і сухой травой. Лось таксама шукае, чым паласавацца. Ён есць галінкі і абгрызае кару дрэў.*

Падчас запісу тэксту абавязкова трэба звярнуць увагу на правапіс слоў з невядомымі арфаграмамі і пастаноўку знакаў прыпынку, якія не вывучалі (калі яны ёсць). Напрыклад, пры запісе прапанаванага вышэй тэксту неабходна папярэдзіць памылкі ў напісанні слоў *па-рознаму, харчуюцца, таксама, паласавацца*; сказаць пра пастаноўку коскі ў пятым сказе.

Пасля запісу ўсіх сказаў вучні даказваюць, што ў іх атрымаўся тэкст, адзначаюць, пра што ў ім гаворыцца.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 52–53, практ. 74. Вучні чытаюць калыханку, вызначаюць, якімі словамі яе трэба дапоўніць з апорай на малюнак. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што першыя тры сказы калыханкі трэба запісаць у слупок.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Што такое тэкст? Які тэкст з тых, што чыталі на ўроку, вам найбольш спадабаўся? Чаму?

## Урок 59. Тэма і асноўная думка тэксту

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра тэму і асноўную думку тэксту, уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту; развіваць уменне складаць тэкст, прыдумваць працяг тэксту з апорай на малюнак; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; пазнаёміць са слоўнікавым словам *мяккі*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне, уменне тлумачыць правапіс слоў; выхоўваць клапатлівыя адносіны да птушак.

***Абсталяванне:*** бавоўна; малюнкі (фотаздымкі), на якіх адлюстравана, як зімуюць вожык, мядзведзь, заяц, цецярук.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 74.***

Настаўнік чытае калыханку, а вучні хорам дагаворваюць словы, якімі яе дапаўнялі.

— Што такое тэкст? Ці можна сказы з практыкавання назваць тэкстам? Дакажыце. Якія словы ў тэксце падказалі, што гэта калыханка?

Вучні называюць словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае, і аргументуюць свой выбар. *(У слове «сваёй» літара* ***ё*** *абазначае два гукі; у слове «спіць» літара* ***ь*** *гука не абазначае; у слове «будзе» гук* [дз'] *на пісьме абазначаецца дзвюма літарамі —* ***д*** *і* ***з****.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Тры падрыхтаваныя вучні чытаюць па ролях тэкст на с. 53 вучэбнага дапаможніка.

Настаўнік прапануе вучням абмеркаваць у парах, які праект пра снег можна падрыхтаваць, якую асноўную думку ў ім трэба выказаць. Выслухоўваюцца прапановы вучняў. Пры гэтым робіцца акцэнт на тэме і асноўнай думцы праектаў, якія агучваюць вучні. Добрыя ідэі можна больш падрабязна абмеркаваць у пазаўрочны час і падумаць наконт іх рэалізацыі.

— Як вы адказалі б на пытанне: «Што такое тэма і асноўная думка тэксту?»

Вучні выказваюць свае меркаванні.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік тлумачыць, што «Тэма і асноўная думка тэксту» — гэта тэма ўрока.

— Як вы думаеце, якія мэты нашага ўрока? Пра што даведаецеся? Чаму навучыцеся?

***Практыкаванне 75.***

Вучні чытаюць тэкст самастойна. Абмеркаванне яго зместу можна арганізаваць па пытаннях:

— Аб чым расказваецца ў тэксце? Як аўтар апісвае птушак? Чаму паміж вераб'ямі пачалася бойка? Якую асноўную думку выказаў аўтар? *(Птушкам трэба дапамагчы, памірыць іх.)*

Вучні разглядаюць малюнак і ў парах абмяркоўваюць магчымы працяг тэксту. Пасля чаго некалькі вучняў расказваюць.

Магчымы варыянт працягу тэксту:

*Юраська ўспомніў, што дома ёсць семкі сланечніку. Хлопчык сабраў іх у пакецік, хуценька апрануўся і выскачыў на вуліцу. Ён пачаставаў птушак: семкі высыпаў на снег. Вераб'і хутка забылі, што сварыліся. Яны з задавальненнем частаваліся. Юраська быў рады, што памірыў птушак!*

Вучні чытаюць прыказкі і вызначаюць тую з іх, якая перадае асноўную думку тэксту. *(Добры чалавек і жывёлу шкадуе. Добры чалавек чулы, уважлівы і ў адносінах да людзей, і да жывёл, да ўсяго жывога.)* Варта абмеркаваць сэнс кожнай прыказкі, прыгадаць сітуацыі, калі іх можна выкарыстаць. *(Якая птушка, такі і галасок. Які чалавек, такія яго паводзіны і манера гаварыць. Хто халадку шукае, той узімку галадае. Каб зімой не галадаць, трэба летам папрацаваць, не адпачываць.)*

Тлумачэнне правапісу слоў з выбарам літар у дужках праводзіцца франтальна. Пасля чаго тры вучні запісваюць па адной прыказцы на дошцы, а астатнія — у сшытках. Пасля запісу праводзіцца зверка з узорам на дошцы.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 55).

— Тэма тэксту — гэта... Асноўная думка тэксту — гэта...

***Практыкаванне 76.***

Перад выкананнем практыкавання пажадана правесці гутарку на тэму «Дапамога жывёлам зімой».

— Як вы дапамагаеце жывёлам перазімаваць? Чаму гэта важна рабіць? Чым можна падкарміць птушак?

Пасля гутаркі кожны вучань самастойна чытае верш, затым — адзін вучань услых. Калектыўнае абмеркаванне, чаму верш можна назваць тэкстам.

— Пра каго расказваецца ў вершы? Як Сярожа дапамагае птушкам? Якімі словамі можна ахарактарызаваць хлопчыка?

Вучні чытаюць выдзеленыя радкі верша і вызначаюць тэму тэксту (*дапамога хлопчыка птушкам*), яго асноўную думку (*трэба падкормліваць птушак кожны дзень*).

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. Словы на правіла правапісу парных звонкіх і глухіх зычных фіксуюцца на дошцы і ў сшытках. Гэтыя словы пажадана запісаць разам з праверачнымі: *па сняжку — сняжок, Сярожка — Сярожа, дарожку — дарожак, кармушкі — кармушак, птушкі — птушак.*

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням скласці новае слоўнікавае слова з літар, «рассыпаных» на дошцы:

к я і м к

Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што ў слове *мяккі* пішацца дзве літары ***к***, лішняй літары на дошцы няма.

Настаўнік цікавіцца, што можа быць мяккім. Пры гэтым варта растлумачыць, што форму слова можна мяняць: *мяккі хлеб, мяккая падушка, мяккая тканіна* і інш.

— Вымавіце слова *мяккі*. Падзяліце яго на склады. *(*[м'а-к'і].*)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [м'а].*)* Назавіце гукі па парадку. *(*[м'], [а], [к'], [і].*)* Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што ў слове вымаўляем доўгі гук [к'].

Вучні знаходзяць слоўнікавае слова *мяккі* на форзацы вучэбнага дапаможніка, разглядаюць малюнак, называюць, што на ім адлюстравана. (На малюнку частка расліны бавоўны, якая ўяўляе сабой мяккія пухнатыя валокны. Настаўнік паказвае расліну, прапануе вучням яе памацаць.) Яшчэ раз акцэнтуецца ўвага на напісанні літар ***кк***. Вучні запісваюць у сшытак слова *мяккі*, ставяць націск, падкрэсліваюць літары ***кк***.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 77.***

Пасля чытання сказаў вучні тлумачаць, чаму іх можна назваць тэкстам, вызначаюць тэму тэксту (*снег — гэта цікавая прыродная з'ява*) і яго асноўную думку (*як утвараецца снег і сняжынкі*). Настаўнік можа пацікавіцца: «Снег — гэта жывая ці нежывая прырода?»

Кожны вучань выбірае, якое заданне будзе выконваць: «пілота» ці «касманаўта». «Пілоты» знаходзяць і зачытваюць сказы пра сняжынкі, а «касманаўты» — пра снег. Арганізуецца самастойнае спісванне адпаведных сказаў кожным вучнем у сшытак, падкрэсліванне літар, напісанне якіх адпавядае ўжо засвоеным правілам. Вуснае тлумачэнне правапісу слоў на вывучаныя правілы праводзіцца франтальна.

***Практыкаванне 78.***

Вучні разглядаюць малюнкі на с. 57 вучэбнага дапаможніка, называюць адлюстраваных жывёл. *(Вожык, заяц, мядзведзь, цецярук.)*

— Ці даводзілася вам бачыць вожыка, зайца, цецерука ў прыродзе? Дзе? У якую пару года гэта было? Як гэтыя жывёлы зімуюць?

Вучні складаюць тэкст, у якім расказваецца пра тое, хто як зімуе. Пры неабходнасці на дошцы можна запісаць апорныя словы. Настаўнік можа дадаткова падабраць малюнкі (фотаздымкі), на якіх адлюстравана, як зімуюць вожык, мядзведзь, заяц, цецярук.

Спосабы арганізацыі работы.

Спосаб 1. Праводзіцца калектыўная работа. Вучні паслядоўна разглядаюць малюнкі, адказваюць на пытанні па іх змесце, адказы аб'ядноўваюцца ў тэкст.

Магчымы варыянт тэксту:

*З наступленнем холаду жыццё многіх жывёл мяняецца. Зімуюць яны па-рознаму. Так вожык упадае у спячку ў загадзя падрыхтаваным гняздзе. Мядзведзь таксама спіць да вясны ў бярлозе. А вось заяц не будуе сабе гнёздаў, сховішчаў. Ён мяняе сваю шубку на белую, яго футра становіцца больш густым і доўгім, што дапамагае выратавацца ад марозу. Заяц харчуецца карой і галінкамі дрэў, засохлай травой. Цецерукі зімой часта сядзяць у снезе, так ім цяплей.*

Спосаб 2. Вучні аб'ядноўваюцца ў чатыры групы. Кожная група рыхтуе паведамленне пра тое, як зімуе жывёла, якую называе настаўнік. Адзін прадстаўнік з кожнай групы выступае з паведамленнем каля дошкі, затым складаецца агульны тэкст. Вучні даказваюць, што ў іх атрымаўся тэкст.

Пасля працы па складанні тэксту вучні з апорай на малюнкі ўдакладняюць, як снег дапамагае жывёлам. *(Снег з'яўляецца дадатковай коўдрай для гнязда вожыка і бярлогі мядзведзя, у якіх яны зімуюць. У зайца поўсць зімой белага колеру, ён зліваецца са снегам, дзякуючы чаму становіцца нябачным для драпежнікаў і паляўнічых. Цецерукі хаваюцца ў снезе ад лютай сцюжы.)*

Вучні запісваюць пад дыктоўку сказ пра цецерука. Арганізуецца каменціраванае пісьмо.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 57, практ. 79. Настаўнік нагадвае, што верш трэба запісаць у слупок; папярэджвае, што аднолькавыя сняжынкі не трэба падкрэсліваць у вучэбным дапаможніку.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Што такое тэма тэксту? Што такое асноўная думка тэксту?

## Урок 60. Тэма і асноўная думка тэксту

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, уменне прагназаваць змест тэксту па яго загалоўку; развіваць уменне складаць тэкст па серыі сюжэтных малюнкаў і з выкарыстаннем апорных слоў; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да прыроды.

***Абсталяванне:*** малюнкі або фотаздымкі, на якіх адлюстраваны пралескі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап актуалізацыі ведаў і праверкі дамашняга задання.**

— Назавіце асноўныя прыметы тэксту. З чаго складаецца тэкст? Што такое тэма тэксту? Што такое асноўная думка тэксту?

***Практыкаванне 79.***

Адзін вучань выразна чытае верш услых. Вызначаецца тэма тэксту. *(Нельга злавіць сняжынкі, яны растаюць у руцэ.)*

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. Узор тлумачэння: «Вымаўляю слова — [с'н'агурка]. Вызначаю ў слове націскны склад. Націск падае на склад [гур]. У пер- [illegible] пішу літару я».

Вучні працуюць у парах:

– узаемаправерка выкананага пісьмовага задання і ўзаемаацэнка на лінейцы для самаацэнкі;

– вызначэнне і паказ адзін аднаму аднолькавых сняжынак на малюнку ў вучэбным дапаможніку.

**3. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік паведамляе вучням, што яны працягваюць вывучаць тэму «Тэма і асноўная думка тэксту». Вучні фармулююць мэты ўрока.

**4. Этап замацавання.**

— Пра якую пару года ідзе размова ў загадцы:

Нібы ў хаце,
ужо цёпла даволі.
У бары яшчэ бела,
ды чарнее ў полі. *(Вясна.)*
*Анатоль Клышка* [1, с. 19]

— Назавіце вясновыя месяцы. Ці ведаеце вы, чаму яны маюць такія назвы?

***Практыкаванне 80.***

Пасля чытання тэксту можна правесці гутарку па пытаннях:

— Чаму месяц сакавік мае такую назву? Якія змены ў прыродзе адбываюцца ў сакавіку? Ці ведаеце вы назвы першых вясновых кветак? (Настаўнік можа паказаць малюнкі або фотаздымкі, на якіх адлюстраваны пралескі.) Якія пералётныя птушкі вяртаюцца? *(Гракі, шпакі, жаўранкі.)*

Вучні па ланцужку тлумачаць правапіс слоў з пропускамі. *(Месяц, вясны, скарачаюцца, празрыстым, з'яўляюцца, першыя, вяртаюцца, месяца.)*

Вучні зачытваюць сказы, у якіх заключана асноўная думка тэксту. *(У сакавіку пачынаецца рух соку ў дрэвах. Адсюль і назва месяца.)* З улікам узроўню падрыхтаванасці навучэнцаў запіс сказаў можна арганізаваць па-рознаму: 1) кожны вучань самастойна спісвае сказы; 2) адзін вучань каменціруе напісанне слоў пры спісванні; 3) вучні запісваюць сказы пад дыктоўку настаўніка.

***Практыкаванне 81.***

Перад чытаннем верша вучні высвятляюць значэнне слова *камора* ў тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка.

Настаўнік прапануе вучням прачытаць назву верша і выказаць свае меркаванні адносна таго, пра што можа расказвацца ў ім.

— Якія значэнні слова *коцікі* вы ведаеце?

Настаўнік выразна чытае верш, вучні сочаць па вучэбным дапаможніку. Затым праводзіцца гутарка па пытаннях:

— Ці адпавядае малюнак у вучэбным дапаможніку вершу? Пра якія коцікі расказваецца ў вершы? Чаму вы так лічыце? Прыметы якой пары года апісваюцца ў вершы? Зачытайце. Дзе з'явіліся коцікі? Якога яны колеру?

Вучні вызначаюць тэму тэксту — *коцікі на вярбе*; асноўную думку — *з'яўленне коцікаў на вярбе сведчыць пра надыход вясны.*

Выкананне пісьмовага задання можна арганізаваць па-рознаму з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў класа:

1. Кожны вучань самастойна выпісвае словы на вядомыя правілы, падкрэслівае адпаведныя літары

ў словах. Праводзіцца франтальная праверка, вучні тлумачаць правапіс слоў.

2. Заданне выконваецца калектыўна. Вучань называе слова, тлумачыць яго напісанне і запісвае слова на дошцы, астатнія вучні — у сшытках. Такім чынам паслядоўна разбіраюцца ўсе словы.

Пасля запісу ўсіх слоў пажадана вызначыць, у якія групы іх можна аб'яднаць.

***Практыкаванне 82.***

Пасля прагназавання зместу тэксту па малюнку і назве вучні чытаюць тэкст, вызначаюць яго тэму (*бярозавік*) і асноўную думку (*бярозавік — напой гаючы*). Значэнне слова *гаючы* дзеці ўдакладняюць у тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка.

Настаўнік прапануе вучням папрацаваць у парах і сфармуляваць пытанні па змесце тэксту. Адзін вучань фармулюе пытанні да першай часткі тэксту, другі — да другой. Вучні ў парах задаюць адзін аднаму пытанні і адказваюць на іх. Два вучні выступаюць у ролі настаўнікаў і задаюць пытанні для ўсяго класа і выклікаюць тых, хто будзе адказваць.

Вучні знаходзяць у тэксце словы на правіла правапісу ***е***, ***ё — я***. Вучань, які знаходзіць слова першым, называе яго, запісвае на дошцы, астатнія вучні — у сшытках.

***Практыкаванне 83.***

Вучні разглядаюць малюнкі, чытаюць словы для даведкі. Настаўнік цікавіцца, на якую тэму можна скласці тэкст па малюнках, якая будзе яго асноўная думка.

Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні паслядоўна расказваюць, што адлюстравана на малюнках. Разглядванне кожнага малюнка можа суправаджацца гутаркай па пытаннях, на якія вучні адказваюць з выкарыстаннем слоў для даведкі.

— Дзе хлопчык праводзіў час? (Вучні прыдумваюць імя хлопчыку.) Каго ён заўважыў побач са старой ліпай? Як сябе паводзілі птушкі?

— Што ў гэты час рабілі рабочыя ў парку? Да якога дрэва яны падышлі?

— Як хлопчык вырашыў дапамагчы птушкам?

— Як вы думаеце, чым закончылася гэта гісторыя?

Тры вучні каля дошкі расказваюць тэкст па частках, якія адпавядаюць малюнкам. Затым некалькі вучняў расказваюць увесь тэкст.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 60–61, практ. 84. Вучні чытаюць верш і даказваюць, што гэта тэкст. Удакладняецца значэнне слоў *плот*, *напраскі*. Вучні знаходзяць «схаваную» назву верша (па першых літарах у кожным радку). Настаўнік тлумачыць, што вершы, у якіх пачатковыя літары кожнага радка ўтвараюць якое-небудзь слова, называюцца акравершамі.

Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што верш трэба запісаць у слупок; першая літара ў кожным радку павінна быць вялікай.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Вучні дагаворваюць сказы:

— Тэма тэксту — гэта... Асноўная думка тэксту — гэта...

## Урок 61. Загаловак тэксту

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, самастойна падбіраць загаловак да тэксту, выбіраць найбольш удалы загаловак сярод прапанаваных, прагназаваць змест тэксту па загалоўку; развіваць уменне пераказваць тэкст з апорай на малюнак, дапаўняць тэкст патрэбнай інфармацыяй, устанаўліваць правільную паслядоўнасць сказаў у тэксце; развіваць уменне пісаць пад дыктоўку, карыстацца арфаграфічным слоўнікам; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да беларускіх народных свят.

***Абсталяванне:*** фотаздымкі (відэазапіс) са святкавання Масленіцы, якія адлюстроўваюць традыцыі свята; прадукты, сярод якіх ёсць тыя, што спатрэбяцца для прыгатавання бліноў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 84.***

Адзін вучань запісвае на дошцы словы, якія ў вучэбным дапаможніку пададзены з выбарам літар, падкрэслівае ўстаўленыя літары. *(Снег, усміхнуўся, пабег, чысты, пацёк, імчыцца.)*

У гэты час вучні чытаюць верш і адказваюць на наступныя пытанні:

— Пра якую пару года расказваецца ў вершы? Якія радкі верша гэта пацвярджаюць? Якая тэма гэтага тэксту? *(Пра вясновыя ручайкі.)*

Праводзіцца праверка пісьмовага задання. Вучань, які запісваў словы на дошцы, тлумачыць іх правапіс. Узор тлумачэння: «Вымаўляю слова — [с'н'эх]. На канцы слова ёсць зычны, парны па звонкасці-глухасці. Напісанне слова трэба правяраць. Для гэтага падбіраю праверачнае слова: змяняю слова так, каб пасля парнага зычнага стаяў галосны — няма *снегу*. У слове *снег* пішу літару ***г***».

— Што называюць тэмай тэксту? Што такое асноўная думка тэксту?

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Вучні чытаюць праблемную сітуацыю на с. 61 вучэбнага дапаможніка.

— Як вы адказалі б Чамучыку: чаму тэкст так называецца? Ці ведаеце вы значэнне слова *Масленіца*? Чаму хлопчык сказаў, што назва тэксту «смачная»? Ці ёсць у вас здагадкі: што перадае загаловак тэксту?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік прапануе вучням самастойна сфармуляваць тэму і мэты ўрока.

***Практыкаванне 85.***

Пасля чытання тэксту праводзіцца гутарка па яго змесце:

— Пра якое старажытнае свята расказваецца ў тэксце? Калі яго святкуюць і як? (Настаўнік паказвае фотаздымкі (відэазапіс) са святкавання Масленіцы. Вучні з апорай на змест тэксту і фотаздымкі

расказваюць пра святкаванне Масленіцы.) Чаму на Масленіцу пякуць бліны?

— Як святкуюць Масленіцу сёння ў вашай вёсцы (вашым горадзе, аграгарадку)?

Вучні вызначаюць тэму і асноўную думку тэксту; выбіраюць загаловак, які найбольш адпавядае тэксту і вызначаюць, што ён перадае.

Вучні разглядаюць малюнак у вучэбным дапаможніку на с. 61 і пераказваюць адпаведную частку тэксту.

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. *(Пякуць, цяпло, святло, на зямлі.)* Вучні робяць вывад: якое правіла ўспаміналі для вызначэння правільнага напісання слоў. *(Правіла правапісу* ***е, ё — я****.)*

Вучні знаходзяць у тэксце і зачытваюць сказы пра святкаванне Масленіцы. Арганізуецца іх спісванне з каменціраваннем. Кожны вучань працуе ў сшытку.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 62).

— Што перадае загаловак тэксту?

***Практыкаванне 86.***

Настаўнік можа прынесці на ўрок розныя прадукты і прапанаваць вучням выбраць сярод іх тыя, якія, на іх думку, спатрэбяцца для прыгатавання бліноў. Пасля чытання тэксту вучні вызначаюць, ці правільна выбралі прадукты.

Вучні чытаюць сказы па ланцужку, дапаўняючы іх патрэбнымі словамі з апорай на малюнак. *(Спачатку ў місцы трэба перамяшаць два яйкі, цукар і соль. Дабавіць шклянку мукі. Затым у цеста дабавіць шклянку малака. Выпякаць бліны на разагрэтай патэльні. Кожны прыгатаваны блін можна змазаць маслам.)*

Вучні ў парах расказваюць адзін аднаму, як прыгатаваць бліны. Адзін вучань расказвае рэцэпт для ўсяго класа.

Запіс прадуктаў, якія спатрэбяцца для прыгатавання бліноў, арганізуецца з каменціраваннем на дошцы і ў сшытках. Пры гэтым вучні ўдакладняюць напісанне слоў па арфаграфічным слоўніку.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 87.***

Вучні самастойна чытаюць радкі з верша. Калектыўна вызначаецца правільная паслядоўнасць радкоў. (Першы радок верша — *Раніцой бліны мы елі.*)

Кожны вучань самастойна запісвае верш, або можна арганізаваць спісванне з каменціраваннем (напісанне слоў кожнага радка тлумачаць розныя вучні). Вучні самастойна падкрэсліваюць словы, якія нельга падзяліць для пераносу (*нас, мы, елі*). Праводзіцца франтальная праверка выкананага задання.

— На якую тэму верш? Якая яго асноўная думка?

***Практыкаванне 88.***

Вучні прагназуюць змест тэксту па загалоўку. Пасля чытання тэксту праводзіцца гутарка па пытаннях:

— Пра якое старажытнае свята расказваецца ў тэксце? Калі яго звычайна ладзілі? Чаму гэта свята было важным для сялян? Як яго адзначалі? Як вы думаеце, чаму гаспадыні выпякалі менавіта жаваранкаў, а не іншых птушак? Чаму людзі чакалі наступлення цяпла? Якая асноўная думка тэксту?

Вучні знаходзяць у тэксце сказ, якім можна падпісаць малюнак. *(Гаспадыні пяклі з цеста «жаваранкаў».)*

Вучні чытаюць выдзеленыя сказы і тлумачаць правапіс слоў, пасля чаго запісваюць сказы пад дыктоўку настаўніка. Праводзіцца самаправерка і зверка з узорам у вучэбным дапаможніку.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 65, практ. 89. Вучні чытаюць народную песню.

— На якое свята спявалі гэту песню? Чаму вы зрабілі такі вывад?

Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што песню трэба запісаць у слупок.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Зварот да праблемнай сітуацыі, якую разглядалі ў пачатку ўрока.

— Як вы зараз адказалі б Чамучыку: чаму тэкст так называецца?

— Пра што новае вы даведаліся на ўроку?

## Урок 62. Падзел тэксту на часткі

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уменне выдзяляць структурныя часткі тэксту (пачатак, асноўную і заключную часткі), размяшчаць часткі тэксту ў патрэбнай паслядоўнасці; развіваць уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, самастойна падбіраць загаловак да тэксту, прыдумваць працяг (пачатак) тэксту, уменне пераказваць тэкст з апорай на малюнак; вучыць ствараць тэкст віншавання; пазнаёміць са слоўнікавым словам *дзверы*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя, паважлівыя адносіны да мамы.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі *клапатлівая*, *старанная*, *лянівая*, *працавітая*, *абыякавая*; картка са слоўнікавым словам *дзверы*.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 89.***

Вучні чытаюць народную песню (можна прапанаваць праслухаць аўдыязапіс песні), вызначаюць тэму (*пра чаканне прылёту жаваранкаў*) і асноўную думку тэксту (*жавароначкі, прыляціце, каб хутчэй наступіла вясна*).

Праводзіцца ўзаемаправерка выкананага пісьмовага задання.

Вучні называюць словы, у якіх падкрэслілі літару ***я*** ў першым складзе перад націскам. *(Прыляціце, вясну, прынясіце, засвяціла, расквяціла.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік і два падрыхтаваныя вучні чытаюць услых праблемную сітуацыю на с. 66 вучэбнага дапаможніка.

Вучні ў парах абмяркоўваюць магчымы пачатак размовы мамы з кімсьці (самастойна вызначаюць з кім). Некалькі магчымых варыянтаў размовы па тэлефоне абмяркоўваюцца і разыгрываюцца ў класе. Настаўнік звяртае ўвагу на ўжыванне ветлівых слоў і выразаў падчас размовы.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе, што сёння на ўроку вучні будуць шукаць адказ на пытанне «З якіх частак складаецца тэкст?», будуць вучыцца дзяліць тэкст на часткі, размяшчаць іх у патрэбнай паслядоўнасці, прыдумваць працяг і пачатак тэксту, пераказваць тэкст з апорай на малюнак; вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, самастойна падбіраць загаловак да тэксту; ствараць тэкст віншавання; пазнаёміцца з новым слоўнікавым словам.

***Знаёмства са слоўнікавым словам.***

Знаёмства з новым слоўнікавым словам можна сумясціць з хвілінкай чыстапісання. Вучні адгадваюць загадку:

Стаяць навідавоку.
Цераз парог — ні кроку. *(Дзверы.)*
*Анатоль Клышка* [1, с. 41]

— Навошта ставяць дзверы ў дамах, кватэрах?

— Вымавіце слова *дзверы*. Падзяліце яго на склады. *(*[дз'в'э-ры].*)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [дз'в'э].*)* Назавіце гукі па парадку. *(*[дз'], [в'], [э], [р], [ы].*)* Колькі зычных гукаў у слове? *(3.)* Вымавіце іх. *(*[дз'], [в'], [р].*)* Колькі мяккіх зычных гукаў у слове? *(2.)* Назавіце іх. *(*[дз'], [в'].*)* Якімі літарамі на пісьме перадаецца гук [дз']? ***(д і з.)***

Настаўнік вывешвае на дошку картку са слоўнікавым словам *дзверы*. Вучні чытаюць слова так, як яно запісана, вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Звяртаецца ўвага на тое, што літару ***ь*** пасля ***дз*** не пішам, нягледзячы на тое, што вымаўляем мяккі гук [дз'].

Вучні запісваюць у сшытак слова *дзверы*, ставяць націск, падкрэсліваюць літары ***дзв***.

— Што можа быць дзвярным? *(Дзвярны замок, дзвярная ручка.)*

Вучні запісваюць спалучэнні слоў *дзвярны замок*, *дзвярная ручка*, падкрэсліваюць літары ***дзв***.

— Якія дзверы ў нашым класе? Запішыце адказ на гэта пытанне.

***Практыкаванне 90.***

Вучні разглядаюць малюнкі на с. 66, расказваюць, як развіваліся падзеі з апорай на пытанні з вучэбнага дапаможніка: «Як дачка паклапацілася пра маці? Што зрабіла дзяўчынка, пакуль матуля спала?» Вучні чытаюць часткі тэксту, называюць, у якой паслядоўнасці іх трэба размясціць і чаму; падбіраюць да тэксту загаловак (напрыклад, «Маміна памочніца»), вызначаюць, на што ён указвае — на тэму ці асноўную думку, запісваюць загаловак у сшытак.

Настаўнік прапануе ахарактарызаваць дзяўчынку. На дошцы можна размясціць карткі са словамі *клапатлівая*, *старанная*, *лянівая*, *працавітая*, *абыякавая*. Сярод гэтых слоў вучні выбіраюць тыя, якія падыходзяць для характарыстыкі дзяўчынкі.

Вучні самастойна перачытваюць частку тэксту, якая адпавядае другому малюнку. Адзін вучань пераказвае яе ўслых для ўсяго класа. Пры наяўнасці часу можна арганізаваць пераказ усяго тэксту па частках. Пры гэтым вучні класа размяркоўваюцца на тры групы. Прадстаўнікі кожнай групы рыхтуюць пераказ канкрэтнай часткі тэксту.

Добра завяршыць працу з тэкстам зваротам да тэмы: «Колькі частак у тэксце, які вы пераказалі?»

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 68).

— Якія часткі вылучаюцца ў тэксце? Якім быў пачатак тэксту з папярэдняга практыкавання? Пра што расказвалася ў асноўнай частцы? Якая частка яшчэ засталася? Пра што ў ёй расказвалася?

***Практыкаванне 91.***

Перад выкананнем практыкавання можна правесці гутарку на тэму «Як я дапамагаю матулі».

Вучні чытаюць часткі тэксту і выказваюць меркаванні адносна таго, якой часткі не хапае. Пасля праслухоўвання і абмеркавання розных варыянтаў развіцця падзей настаўнік можа прачытаць частку тэксту, якой не хапае, з апавядання Клаўдзіі Каліны «Кампот»:

*За абедам мама сказала: «Ну, цяпер пакаштуем кампот нашай дачушкі», — і паставіла перад кожным кубак, а перад Галяй — яе любімы, з дзвюма чырвонымі вішанькамі.*

*Тата адпіў крыху з кубка і зірнуў на маму. Мама зрабіла глыток і паглядзела на Галю* [2].

Вучні робяць вывад, што ў адпаведнасці з думкай аўтара ў тэксце прапушчана асноўная частка.

— Ці можна сказаць, што дзяўчынка старанная? Ці добра Галя памыла яблыкі? Якую параду вы далі б ёй?

Тлумачэнне правапісу прапушчаных літар у словах праводзіцца франтальна. *(Вельмі, дапамагаць, дару<u>чы</u>ла, памыць, дачушка.)* Узор тлумачэння: «Вымаўляю слова — [в'эл'м'і]. У слове мяккі гук [л']. Мяккасць гука на пісьме перадаю літарай мяккі знак. Пасля літары ***л*** пішу ***ь***».

Вучні перачытваюць частку тэксту, у якой расказваецца аб тым, што маці дала дзяўчынцы даручэнне, самастойна спісваюць яе (можна арганізаваць каменціраванае пісьмо). Праводзіцца ўзаемаправерка выкананага задання.

***Калектыўнае выкананне задання на дошцы.***

Настаўнік запісвае на дошцы словы:

| | | | |
|---|---|---|---|
| сок | сушаныя яблыкі | соль | цукар |
| алей | ш..кала.. | в..да | |

Вучні тлумачаць, якія літары прапушчаны ў словах, і дапісваюць іх.

— Ці дапамагалі вы калі-небудзь варыць кампот? Што з пералічанага на дошцы спатрэбіцца для яго прыгатавання? *(Сушаныя яблыкі, вада, цукар.)* Раскажыце, як зварыць кампот. (Пры неабходнасці настаўнік дапамагае вучням.) Ці атрымаўся ў вас тэкст? Дакажыце.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 92.***

Вучні чытаюць тэкст, вызначаюць яго тэму і асноўную думку, падбіраюць загаловак. Затым вылучаюць пачатак і асноўную частку.

Можна правесці гутарку па наступных пытаннях:

— Якое свята згадваецца ў тэксце? Як дзеці разам з татам [illegible]

зрабіла Аня? Што прыгатавала Наташа? Чым тата вырашыў парадаваць маму? Што прыгатаваў Дзіма?

Выслухоўваюцца разважанні вучняў пра магчымы працяг тэксту (заключную частку). Напрыклад: *Кожны сказаў матулі шчырыя словы віншавання. Мама адчувала сябе самай шчаслівай!*

Тлумачэнне правапісу выдзеленых літар у словах праводзіцца франтальна.

Вучні запісваюць пад дыктоўку настаўніка асноўную частку тэксту.

***Практыкаванне 93.***

Перад выкананнем практыкавання можна правесці гутарку па пытаннях:

— Ці падпісвалі вы калі-небудзь віншавальныя паштоўкі? З якіх слоў звычайна пачынаецца віншаванне? *(Са звароту да таго, каму яно адрасуецца.)* Аб чым расказваецца ў асноўнай частцы? *(Указваецца свята, з якім віншуюць, і пажаданне.)* Якімі словамі завяршаюць віншаванне? *(Пазначаюць, ад каго віншаванне.)*

Спачатку вучні чытаюць словы для даведкі, а затым — тэкст віншавальнай паштоўкі, дапаўняючы яго гэтымі словамі.

— Як вы віншуеце сваіх матуль і бабуль з Днём жанчын? Што вы ім жадаеце?

Пісьмовае заданне можна выканаць па-рознаму:

1) у адпаведнасці з заданнем у вучэбным дапаможніку: кожны вучань самастойна спісвае сказы з пажаданнямі;

2) калі на ўроку працоўнага навучання або ў пазаўрочны час вучні зрабілі паштоўкі для матуль сваімі рукамі, настаўнік прапануе падпісаць іх пабеларуску з апорай на тэкст віншавання з вучэбнага дапаможніка.

***Абагульняльная гутарка па раздзеле «Тэкст».***

— З чаго складаецца тэкст?

— Ці любыя сказы з'яўляюцца тэкстам?

— На што можа ўказваць загаловак тэксту?

— Што такое тэма тэксту?

— Што такое асноўная думка тэксту?

— Якія часткі вылучаюць у тэксце?

З улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў класа настаўнік можа прапанаваць вучням самастойна прадумаць і сфармуляваць пытанні па раздзеле, абмеркаваць іх у парах, а потым задаць усяму класу. Пры гэтым аднолькавыя пытанні не паўтараць.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 70, практ. 94. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што ўвесь верш спісваць не трэба, а толькі адзін слупок на выбар.

— Якой літарай на пісьме абазначаецца гук [ц']?

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Успомніце, якія мэты былі пастаўлены ў пачатку ўрока. Ці атрымалася іх дасягнуць?

## СКАЗ

### Урок 63. Сказ

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра сказ як адзінку мовы, якая валодае сэнсавай і інтанацыйнай завершанасцю; адпрацоўваць уменне вызначаць межы сказаў і правільна афармляць іх на пісьме; развіваць уменне прагназаваць змест тэксту па загалоўку, самастойна падбіраць загаловак да тэксту, апісваць кветкі з апорай на малюнак; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць беражлівыя адносіны да кветак.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, наборнае палатно з літарамі і карткамі «слова», «сказ», «тэкст», «гукі», «літары»; малюнак ці фотаздымак, які адлюстроўвае надыход вясны; падборка малюнкаў ці фотаздымкаў пралескі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 94.***

Арганізуецца конкурс на выразнае чытанне верша (па жаданні). Вынікі падводзяць вучні класа. Яны выказваюцца па ацэнцы выступленняў аднакласнікаў па крытэрыях гучнасці, інтанацыйнай выразнасці і захавання паўз.

Абмяркоўваюцца пытанні: «Якая тэма тэксту? Якая асноўная думка? Што можа выражаць загаловак тэксту?» Вучні прыводзяць прыклады падабраных загалоўкаў і гавораць, што кожны з іх адлюстроўвае: тэму ці галоўную думку.

Вучні называюць словы з гукам [ц'], гавораць, якой літарай ён абазначаны, як перадаецца яго мяккасць.

— Знайдзіце ў вершы слова з гукам [й']. Як ён перадаецца на пісьме?

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

Вучні чытаюць словы на картках: «слова», «сказ», «тэкст», «гукі», «літары». Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на змест дапаможніка.

— Якія раздзелы мы ўжо прайшлі? Якія засталіся? Як вы думаеце, які наступны раздзел мы будзем вывучаць?

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Вучні разглядаюць малюнак ці фотаздымак на дошцы, які адлюстроўвае надыход вясны, і адказваюць на пытанні:

— Якая пара года наступае? Па якіх прыметах пра гэта можна здагадацца? Які дзень адлюстраваны: сонечны, пагодлівы ці пахмурны? Які настрой перадаецца на малюнку? З дапамогай чаго ён ствараецца?

Настаўнік запрашае вучняў уважліва паслухаць праблемную сітуацыю і сказаць, з дапамогай чаго выказалі думку мама, дзядуля і сын. Пасля праслухоўвання вучні адказваюць на гэтае пытанне. Далей настаўнік запытваецца: «Гэта былі аднолькавыя ці розныя сказы? Ці згодныя вы з Чамучыкам, што "навіна адна, а перадалі мы яе па-рознаму"?» (Вучні выказваюць свае меркаванні і аргументуюць іх.)

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— На якое пытанне мы павінны адказаць на працягу ўрока? (Вучні чытаюць праблемнае пытанне хорам.) Хто паспрабуе зараз адказаць на яго? (Абмеркаванне адказаў.)

***Практыкаванне 95.***

Настаўнік прапануе прачытаць запісы пад нумарамі і сказаць, які з іх можна назваць сказам, а якія — нельга і чаму. Асноўная ўвага звяртаецца на закончанасць думкі і інтанацыйную завершанасць.

1) Гэта сказ. У ім выказана думка пра прыроду, як яна абуджаецца ад зімовага сну. Думка выказана поўнасцю, значыць, завершана.

2) Гэты запіс нельга назваць сказам, таму што ў ім думка не завершана, выказана не поўнасцю. Гэта падказвае інтанацыя. Каб атрымаўся сказ, лагічна дадаць словы *сонца* і *промні*: *Сонца пасылае на зямлю свае ласкавыя промні*.

3) Гэты запіс нельга назваць сказам, таму што ў ім думка не выказана, інтанацыя парушана. Каб атрымаўся сказ, лагічна пераставіць словы: *Пад цёплым сонцам растаюць доўгія ледзяшы*.

Вучні выпраўляюць дэфармаваныя сказы, тлумачаць, якую думку выказвае кожны.

***Чытанне і абмеркаванне рубрыкі «Важная інфармацыя».***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на інфармацыю рубрыкі (с. 73). Дзеці самастойна знаёмяцца з ёй. Настаўнік папярэджвае, каб вучні не забыліся пра гэта пры запісе сказаў.

Выпраўленыя сказы практыкавання 95 запісваюцца пад дыктоўку настаўніка. Узаемаправерка.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні чытаюць правіла.

— Што яшчэ вы даведаліся пра сказ з правіла? Паўтарыце дзве думкі, выказаныя ў правіле. Дакажыце, што прыклады ў правіле з'яўляюцца сказамі.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 96.***

Вучні чытаюць загаловак тэксту і прагназуюць яго змест. Пасля чытання тэксту выконваюць астатнія заданні перад тэкстам практыкавання.

— Знайдзіце сказы, у якіх гаворыцца пра Янку. Прачытайце іх. Якая думка выказваецца ў кожным сказе? (Аналагічна настаўнік запытваецца аб сказах пра Сяргея.)

Вучні выпісваюць сказы пра хлопчыкаў па ўласным выбары.

— Раскажыце, дзе бы вы шукалі вясну.

***Практыкаванне 98*** (у нумарацыі практыкаванняў 97 і 98 тэхнічны збой).

Настаўнік прапануе разгледзець малюнак і назваць кветку. Гутарка па малюнках ці фотаздымках на дошцы: «Якая кветка пралескі: якога колеру, колькі пялёсткаў, якія лісцікі? Калі расцвітае? Чаму так радуе людзей?» (Настаўнік паведамляе, што гэта расліна з'яўляецца лекавай.)

Настаўнік выразна чытае верш. Вучні адказваюць на пытанні пасля верша, чытаюць яго самастойна.

— Чаму кветку так назвалі? Прачытайце.

Вучні выконваюць заданні з апошняга абзаца. Трэба звярнуць увагу, што ў вершаваным творы колькасць сказаў і радкоў не супадае. Так, у вершы «Пралеска» чатыры сказы. Кожны сказ трэба прачытаць з адпаведнай інтанацыяй. Выпісванне слоў трэба правесці з каменціраваннем — вызначэннем тыпу арфаграм з дапамогай форзацаў у канцы вучэбнага дапаможніка.

***Практыкаванне 97 (самастойная работа).***

Настаўнік прапануе прачытаць, што запісана.

— Ці можна назваць запіс тэкстам? Чаму? Што трэба зрабіць, перш чым адказаць на гэта пытанне?

Вучні дзеляць тэкст на сказы, чытаюць па адным сказе. Адказваюць, якая думка выказана, ці закончана яна.

— На якую тэму тэкст? Які загаловак можна яму даць?

Перад запісам тэксту праводзіцца арфаграфічная падрыхтоўка: знайсці словы з арфаграмамі на вядомыя правілы, растлумачыць іх правапіс; затым паўтарыць інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя».

Пасля падрыхтоўкі вучні самастойна запісваюць тэкст і робяць самаправерку. Выкананую работу правярае настаўнік.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 74, практ. 99. Настаўнік чытае верш, вучні сочаць па падручніку. Потым вызначаюць, якімі сказамі можна падпісаць кожны малюнак. Настаўнік падкрэслівае, што трэба запісаць толькі гэтыя сказы.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Чым сказ адрозніваецца ад тэксту? Чым характарызуецца сказ?

## Урок 64. Навучальны пісьмовы падрабязны пераказ апавядальнага тэксту*

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне пераказваць апавядальны тэкст па пытаннях і правільна афармляць яго на пісьме; развіваць звязнае вуснае і пісьмовае маўленне, памяць, мысленне; выхоўваць беражлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** малюнкі цыбулі, капусты, часнаку; картка з тэкстам «Смачная цыбуля» для кожнага вучня.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік паведамляе вучням, што на занятках яны будуць рабіць падрабязны пісьмовы пераказ тэксту.

— Як трэба працаваць, каб пераказ атрымаўся паспяховым? *(Трэба ўважліва слухаць тэкст, разабрацца са значэннем слоў, вызначыць часткі тэксту, растлумачыць правапіс слоў.)*

**3. Этап работы з тэкстам пераказу.**

Настаўнік прапануе вучням адгадаць загадку, выбраць адгадку сярод малюнкаў (цыбулі, капусты, часнаку), растлумачыць выбар:

Летам я рагатая,
Восенню — хвастатая.
Хоць і горкая зусім,
Ды патрэбная ўсім. *(Цыбуля.)*
*Міхась Пазнякоў* [3]

* Навучальны пісьмовы пераказ выконваецца ў сшытках для навучальных работ.

— Тэкст, які будзем пераказваць, называецца «Смачная цыбуля». Што можа быць смачным? Як вы думаеце, ці можа цыбуля быць смачнай? Калі? Прывядзіце прыклады.

***Чытанне тэксту настаўнікам.***

— Уважліва паслухайце тэкст і скажыце, чаму цыбуля падалася смачнай.

Настаўнік чытае тэкст. Вучні слухаюць і сочаць па тэксце.

**Смачная цыбуля**

Бабуля з унучкай Алесяй пайшлі садзіць цыбулю. Бабуля акуратна ўторквала цыбуліны ў ямкі. Наступны радок садзіла ўнучка.

Мінулі дні. Пайшла Алеська ў агарод і нарвала сакавітых пёрак. Ела дзяўчынка зялёную цыбулю з духмяным хлебам. Чаму цыбуля здавалася ёй смачнай? Таму што дзяўчынка садзіла яе сваімі рукамі. *(52 слова)*

*Паводле Міхася Даніленкі* [4]

***Тлумачэнне незразумелых слоў.***

Настаўнік запытваецца, якія словы былі незразумелыя. Тлумачэнне даюць тыя вучні, якія гэтыя словы зразумелі. Калі вучні не запытаюцца, настаўнік просіць растлумачыць значэнне слоў *сакавітыя пёркі* (маладыя зялёныя лісцікі цыбулі).

***Гутарка з мэтай вызначэння ступені разумення вучнямі тэксту.***

Самастойнае чытанне тэксту вучнямі і адказ на пытанні словамі тэксту:

— Якую справу рабілі бабуля з унучкай? Чым займалася бабуля? Як унучка дапамагала бабулі? Што праз нейкі час пакаштавала Алеська? З чым яна ела пёркі цыбулі? Чаму цыбуля падалася ёй смачнай?

***Праца над зместам і будовай тэксту.***

У франтальна арганізаванай гутарцы вызначаецца тэма тэксту (*дапамога бабулі, перайманне вопыту працы на зямлі*) і яго галоўная думка, якая можа быць вызначана прымаўкай: *найлепшы хлеб — ад сваёй працы*. Вучням прапануецца падзяліць тэкст на тры сэнсавыя часткі згодна з планам:

1. Веснавыя работы па пасадцы цыбулі.
2. Дзяўчынка пакаштавала вынік сваёй працы.
3. Найлепшы хлеб — ад сваёй працы.

Вучні расказваюць, пра што гаворыцца ў кожнай частцы тэксту.

***Праца над моўнымі сродкамі тэксту.***

Аналіз мовы апавядання прадугледжвае вызначэнне значэнняў слоў *мінулі* (*прайшлі*), *здавалася* (*уяўлялася*), *смачны* (*прыемны на смак, апетытны*), *сакавітых* (*напоўненых сокам*), *уторквала* (*усаджвала ў зямлю*).

Пры падрыхтоўчай працы трэба, каб вучні знайшлі ў тэксце, якімі словамі аўтар называе гераіню тэксту (*унучка, Алеся, дзяўчынка, яна*). Неабходна звярнуць увагу вучняў, што ў тэксце ўжыты дзве формы імя дзяўчынкі — звычайнае Алеся і ласкавае Алеська; выслухаць меркаванні вучняў: чаму яе так называе аўтар? што ён гэтым падкрэслівае? *(Ласкавае імя прыменена ў той частцы, дзе дзяўчынка атрымала вынік сваёй працы. Гэтым аўтар падкрэслівае сваё паважлівае стаўленне да яе.)*

Настаўнік адзначае, што трэцяя частка пабудавана як пытанне і адказ на яго. Вучні пры вусным пераказе гэтай часткі павінны перадаць інтанацыйнае афармленне пытальнага і клічнага сказаў. Інтанацыяй тлумачаць пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы сказаў.

***Вусны пераказ тэксту.***

Вусны пераказ тэксту вучнямі арганізуецца ланцужком па групах з трох вучняў. Чытанне тэксту вучнямі па частках. Пераказ кожнай часткі па апорных словах і пытаннях (змешчаны на дошцы).

| Пытанні | Апорныя словы |
|---|---|
| 1. Як бабуля з унучкай Алесяй садзілі цыбулю? | пайшлі, уторквала, наступны радок |
| 2. Навошта Алеська нарвала сакавітых пёрак? | мінулі, нарвала, ела |
| 3. Чаму цыбуля здавалася смачнай? | сваімі рукамі |

***Арфаграфічная работа.***

Арфаграфічная работа праводзіцца са словамі (*з*) *унучкай Алесяй, пайшлі, уторквала, наступны, мінулі, таму што* (асобна). Гэтыя словы выпісваюцца на дошку з каменціраваннем. Па заданні настаўніка вучні прыводзяць з тэксту прыклады слоў на вывучаныя правілы:

1. Правапіс парных звонкіх і глухіх зычных на канцы слоў (з падборам праверачных слоў): *агарод*.
2. Правапіс ***я*** ў першым складзе перад націскам (з падзелам на склады): *дзяўчынка, зялёную*.

***Напісанне пераказу.***

Вучні самастойна пішуць пераказ, абапіраючыся на пытанні і апорныя словы. Праверка напісанага тэксту вучнямі. Падчас праверкі тэкст чытаецца вучнямі двойчы. Спачатку прасочваецца правільнасць перадачы зместу тэксту. Другое чытанне мае на мэце прасачыць правільнасць напісання слоў і пастаноўкі знакаў прыпынку.

**4. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Чым вам спадабаўся тэкст? Што было складаным пры напісанні пераказу? Як вы дапамагаеце сваім бабулям?

Урокі 65–67 гл. у электронным дадатку.

*Працяг будзе.*

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. *Клышка, А. К.* Тысяча арэшкаў: загадкі для дзяцей і дарослых / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 127 с.
2. *Каліна, К. К.* Хлопчык-пакідайчык: апавяданні і казкі / К. К. Каліна. — Мінск : Беларусь, 1970. — 38 с.
3. *Верціхоўская, М. І.* Залатыя зярняты: тлумачальна-перакладны слоўнік: 2 кл. / М. І. Верціхоўская. — Мінск : Пачатковая школа, 2009. — 176 с.
4. *Даніленка, М. П.* Як дажджы памірыліся: апавяданні, казкі : кн. для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Даніленка. — Мінск : Нар. асвета, 2013. — 56 с.